Ніхто не ведае, як Лісянё апынулася ў глухім начным лесе.

Яму было самотна і страшна. Высока ў небе ззялі зоркі, але навокал панавала цемра.

— Вер у сябе, — чамусьці сказала Лісянё і паглядзела ўверх.





Пасля гэтых слоў нейкім чароўным чынам з-за воблака выглянуў месяц. Стала святлей.

Лісянё ўспомніла пра дом. Дзе ён? Куды ісці?





— Вер у сябе, — пачула яно ўнутраны голас.

Лісянё асцярожна і нясмела адправілася на пошукі дому.